**АГОНЬ**
*Ахоўвае ад Нядобрых Духаў. Выкарыстоўваецца ў час абрадаў і магічных дзеянняў*

## III. *"СВЯТА РАЎНАДЗЕНСТВА"*
13.15 – 13.35

| Музычнае суправаджэнне: | Абрадавыя гульні і традыцыйныя танцы: |
|---|---|
| **"Мілавіца"** *(М.Сітко)* | *"Лявоніха"*<br>*"Кракавяк"*<br>*"Падэспан"*<br>*"Нарэчанька"*<br>*"Ва саду лі"*<br>*"Полька з дзеркачом"*<br>*"Полька-расцяпа"*<br>*"Проса" (гульня)*<br>*"У карагодзе мы былі" (карагод-гульня)* |
| **"Вянок"** *(А. Пятроўская)* | *"Акуліна"*<br>*"Страдания"*<br>*"Падэспан"*<br>*"У гарочку" (гульня)* |
| **"Раме"** *(В.Казацэн)* | *"Верабей"*<br>*"Ойра літоўская"*<br>*"Базар"* |
| **"Этна-Суполка"** *(Т.Шадунова)* | *"Падэспан"*<br>*"Юрачка"*<br>*"Картузэ"*<br>*"Кракавяк"*<br>*"Какетка"*<br>*"Грушка" (карагод-гульня)*<br>*"У карагодзе мы былі" (карагод-гульня)*<br>*"Явар"* |

### Этнаграфічныя звесткі

*П.В.Шэйн:* "У Гомельскім павеце дзяўчаты збіраліся гуртам і ішлі на узвышаныя месцы, звычайна каля гумнаў, падсцілалі салому і, пасеўшы на яе, спявалі да позняй ночы веснавыя песні. Гэтыя песні разносіліся па наваколлю і былі чуваць на суседніх "зборных пунктах". Часам спявалі на чарзе: у адным месцы пачнуць і спыняцца, у другім працягваюць. Хлопцы ж з дудкамі і гармонікамі пераходзілі ад адной групы да другой".

**ЗЯМЛЯ**
*Прастора і месца існавання людзей і ніжэйшых (зямных) багоў*

## *Слоўнічак*
*удзельніка абрадавага свята:*

**Абрад** - сукупнасць рытуальных дзеянняў, якія адлюстроўваюць рэлігійныя ўяўленні ці бытавыя традыцыі

**Абрадавае свята** - масавае культурнае мерапрыемства з духоўна-магічным дзеяннем, якое праводзіцца эстэтычнымі сродкамі святочнай культуры (песня, танец, карагод, музыка, карнавалізацыя, атрыбутыка). Прымеркавана да асаблівых перыядаў жыцця чалавека, звязана з момантамі узвышанага ўрачыстага стану яго душы

**Бог** - вышэйшая звышнатуральная істота, надзеленая вышэйшым розумам, дасканаласцю, якая кіруе светам (у розных абліччах – Ярыла, Вялес...)

**Вырай** - прастора ў Небе, куды адлятаюць на зіму птушкі і душы памерлых людзей

**Веснянка - (веснавая загукальная песня)** "самастойная" песня-абрад, якая заўсёды мела магічнае прызначэнне. Яе выкананне не суправаджалася ніякімі абрадавымі дзеяннямі. Веснянкі самі фарміруюць абрадавыя дзеянні.

**Загуканне** - веснавое *свята* і старажытны рэлігійны *абрад*. Рытуальныя дзеянні і песні абраду накіраваны на тое, каб наклікаць і паскорыць вяртанне цёплага, сонечнага і ўрадлівага перыяду года – *Вясны*. Кожны беларус з Ёю звязвае свае надзеі на багаты ўраджай, дабрабыт і шчасце

**Марэна** - смяротны дух, які пануе над зямлёй і людзьмі. Калі прыходзіць час вясны – вымушана хавацца ў Наўі

**Птушкі** - персанажы архаічных міфаў, з`яўляюцца вешчымі. Міфічныя істоты, якія з`яўляюцца паведачамі Бога (сарока, воран, жаваронак, бусел)

**Рытуал** - (лац. ritualis – абрадавы) – стэрэатыпныя і паўтаральныя дзеянні ў рэлігійных, побытавых ці гаспадарчых абрадах, святах

**Ярыла (Юр'я – хрысціянскі святы)** - Бог у сваім веснавам абліччы, апякун урадлівасці і кахання. З яго жыццём звязаны пачатак сапраўднай *Вясны* (ст.славянс."Яр"– Весна, "яравы" - веснавы)

Цэнтральны дзіцячы парк імя М.Горкага

***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў***

**Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Вікторыя» г.Мінска**

Педагогі (кіраўнікі фальклорных калектываў), дзеці і моладзь г.Мінска і Мінскай вобласці

кампанія «Будзьма беларусамі»

# А б р а д а в а е   с в я т а
# ГУКАННЕ ВЯСНЫ



***Памажы, Маці, нам Вясну гукаці!***
***Божа, дай, Божа, дай, Божа, памажы!***

***Дата правядзення:*** 4 красавіка
***Час правядзення:*** 12.00 – 14.35
***Месца правядзення:*** Цэнтральны дзіцячы парк г.Мінска

Мінск 2013